## Білет 3

**Практычнае заданне.**
**Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Якія прынцыпы знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь?
2. Як у Пасланні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу (сакавік 2023 г.) вызначаны прыярытэтны напрамак знешняй палітыкі Беларусі на сучасным этапе?
3. Прывядзіце факты, якія пацвярджаюць, што прыярытэтны напрамак знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, заяўлены ў Пасланні, ужо рэалізуецца.
4. Прывядзіце факты, якія пацвярджаюць шматвектарны характар знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.

**I. З Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь** *(у рэдакцыі 15.03.2022 г.)*

**Артыкул 8.** Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства.
Рэспубліка Беларусь у адпаведнасці з нормамі міжнароднага права можа на добраахвотнай аснове ўваходзіць у міждзяржаўныя ўтварэнні і выходзіць з іх.
Не дапускаецца заключэнне міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі.

**Артыкул 18.** Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы зыходзіць з прынцыпаў роўнасці дзяржаў, непрымянення сілы або пагрозы сілай, непарушнасці межаў, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права. Рэспубліка Беларусь выключае ваенную агрэсію са сваёй тэрыторыі ў дачыненні да іншых дзяржаў.

**II. З сумеснай дэкларацыі Рэспублікі Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікі аб устанаўленні адносін і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства** *(15.09.2022)*

2. Бакі выказваюць узаемную рашучую падтрымку па пытаннях, якія датычацца асноўных інтарэсаў Бакоў, такіх як суверэнітэт, незалежнасць і тэрытарыяльная цэласнасць...

6. Бакі вызначаюць прыярытэтнымі напрамкамі супрацоўніцтва пашырэнне ўзаемных прамых інвестыцый, стварэнне сумесных высокатэхналагічных інавацыйных вытворчасцей, развіццё сумеснага бізнесу паміж суб'ектамі гаспадарання дзвюх краін, заахвочванне прадпрымальніцкай ініцыятывы. Бакі маюць намер развіваць супрацоўніцтва ў галіне лічбавага развіцця, укараняць лічбавыя тэхналогіі ва ўзаемным гандлі таварамі і паслугамі.

7. Бакі сканцэнтруюць намаганні на развіцці Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка "Вялікі камень" як міжнароднага індустрыяльнага кластара і горада-спадарожніка г. Мінска.

**III. Аб прыярытэтных напрамках знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь** *(па матэрыялах сайта Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь)*

Выбудоўваючы адносіны з усімі замежнымі партнёрамі на аснове раўнапраўнага і ўзаемапаважлівага дыялогу, Беларусь, як і любая іншая дзяржава, канцэнтруе свае знешнепалітычныя намаганні на шэрагу найбольш важных і перспектыўных вектараў. Сярод іх - перш за ўсё Расійская Федэрацыя, узаемадзеянне з якой будуецца на аснове Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

Адносіны ўсебаковага стратэгічнага партнёрства развіваюцца з Кітайскай Народнай Рэспублікай.

Беларусь займае актыўную і канструктыўную пазіцыю ў інтэграцыйных аб'яднаннях на постсавецкай прасторы - Еўразійскім эканамічным саюзе, Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Для ўмацавання міжнародных пазіцый Беларусі ажыццяўляецца паскоранае афармленне поўнафарматнага членства нашай краіны ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС).

«Уступленне Беларусі ў ШАС у якасці паўнапраўнага члена адкрывае новыя перспектывы. Гэта арганізацыя сёння - адно з самых буйных у свеце рэгіянальных аб'яднанняў. З ім мы самі станем мацнейшымі і зробім яго больш моцным, прадаставіўшы дадатковыя магчымасці для супрацоўніцтва па многіх напрамках, уключаючы вытворчую кааперацыю і лагістыку, і прадоўжыўшы Шаўковы шлях", - адзначыў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка 31 сакавіка 2023 г. у Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу: - Так званы разварот на Усход у нашай палітыцы - гэта самая што ні на ёсць разумная рэальнасць, прадыктаваная духам часу».

Рэспубліка Беларусь працуе таксама над тым, каб на доўгатэрміновую перспектыву ўзмацніць узаемадзеянне з шырокім колам краін Азіі, Блізкага Усходу, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

На фоне палітычнага і эканамічнага націску Еўрапейскага саюза, ЗША і іншых краін Захаду на Беларусь адносіны з імі трансфармаваліся з партнёрскіх і ўзаемавыгадных у жорсткае супрацьстаянне. Разам з тым Беларусь застаецца адкрытай для дыялогу з заходнімі краінамі з мэтай выхаду на пазітыўную траекторыю супрацоўніцтва, найперш у гандлёва-эканамічнай і інвестыцыйнай сферах.